Зместам *другога этапа гістарыяграфіі* (з пачатку па 60-я гг. ХІХ стст.). з'яўляецца першаснае асэнсаванне арыгінальнасці культурнай спадчыны тэрыторыі Беларусі. Ён адметны звесткамі, што збіраліся мэтанакіравана, у тым ліку і падчас экспедыцыйнай працы. Асноўны іх змест – фіксацыя мясцовага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу. У той жа час распачалося этнаграфічнае і археалагічнае вывучэнне матэрыяльнай культуры беларусаў.

Пэўныя назіранні і каментарыі аб традыцыйнай духоўнай культуры жыхароў Панямоння прыведзены ў працах І. і І. Ляхніцкіх (1815, 1817). Але першая сапраўды навуковая публікацыя, зробленая на беларускім матэрыяле, была прадстаўлена замежным аўтарам: артыкул 1817 г. польскай даследчыцы М. Чарноўскай, з комплекснымі апісаннямі абрадаў вясення-летняга перыяду (Радаўніца, Зялёныя святкі, Купалле). Маштабныя даследаванні ў галінах фальклору, этнаграфіі і археалогіі, праводзіў беларускі навуковец З. Даленга-Хадакоўскі. Але вынікі той піянерскай краязнаўчай працы, ў большасці, застаюцца дагэтуль невыдадзенымі (дарэчы, як і работы цэлага шэрагу мясцовых даследчыкаў тых часоў). Толькі некаторыя з іх па тэме каляндарнай традыцыі – лінгвістычныя дадзеныя па мясцовай астраніміі – прадстаўлены ў артыкуле 1820 г.. Як і З. Даленга-Хадакоўскі, яго паслядоўнік Х. Лях-Шырма выказваў меркаванне аб вуснай народнай творчасці, як аб "краевугольным камяні" для тлумачэння "гісторыі, абрадаў, рэлігіі … нашага племені" (1818).

Асэнсаванне традыцыйнага календара беларусаў адпавядала агульнаеўрапейскай тэндэнцыі. Між тым, гэты этап адметны відавочнай перавагай прац замежных даследчыкаў. Менавіта на тэрыторыі Беларусі сутыкнуліся два канцэптуальных падыходы – польскай і расійскай навуковых школ, што ў сваю чаргу зыходзіла з важкіх палітычных прадумоў. Устойлівы паток навуковых публікацый па тэме традыцыйнага календара Беларусі змяшчаў выключна фальклорна-этнаграфічныя звесткі, і быў прадстаўлены навуковымі школамі Польшчы (Л. Галембёўскі (1831 – тут, і далей па п. 1.3. гл. Дадатак 1), Я. Чачот (1837 – 46), Ю. Крашэўскі (1837 – 50), І. Ярашэвіч (1848), інш.), а таксама Расіі (Снягіроў І.М. (1837), А. Цярэшчанка (1848), інш.), побач з якімі паступова вылучалі першыя працы мясцовыя аўтары: К. Фалютынскі (1828), А. Мухлінскі (1830), Л. Юцэвіч (1837, 1839), А. Кіркор (1839), А. Рыпінскі (1840), Я. Баршчэўскі (1843), В. Рэўт (1843), І. Храпавіцкі (1845), П. Шпілеўскі (1846), Я. Тышкевіч (1847), Р. Зянкевіч (1847, 1851, 1853), Р. Друцкі-Падбярэскі (1848).

Этап адметны паступовым пашырэннем яго тыпалагічнага і тэматычнага кола гістарыяграфіі. Так, апісанні абрадаў станавіліся падрабязнымі, дапаўняліся суправаджаючым тэкставым (у тым ліку паэтычным) і нотным матэрыялам, набываючы, такім чынам, комплексны выгляд. Але, не заўсёды

дакладна адзначалася лакалізацыя атрыманых звестак. Аналітычныя раздзелы тых работ былі скіраваны найперш на асэнсаванне міфалагічнага кантэксту. Азабліва адзначым наватарскія па зместу работы Л. Юцэвіча, дзе выконваліся спробы храналагічнай сістэматызацыі каляндарных падзей і абрадаў, правядзення параўнальнага сінхроннага аналізу, і ўпершыню падкрэслена сакральная роля вялікіх камянёў у разуменні мясцовага грамадства. Мае вагу і адметная ацэнка ролі фальклору, зробленая Ю. Крашэўскага: "і спевы, і гутаркі, і народная паэзія ёсць у пэўным сэнсе матэрыялам гістарычным".

Маштабныя даследванні народнага календара, як і наогул этнаграфічнай спадчыны беларусаў разгарнуліся з заснаваннем Рускага геаграфічнага таварыства (РГТ) ў 1847 г., і рэалізацыяй яго этнаграфічнай праграмы, калі значна павялічылася кола беларускіх даследчыкаў старажытнасці, а таксама і тэрыторыя іх навуковай дзейнасці. Тэматычна тыя працы насілі фальклорна-этнаграфічны характар, з перавагай натуральнага адлюстравання мясцовых рэалій. У іх выніку ў 60-х гг. XIX ст. разгортвалася фіксацыя падзей поўнага гадавога каляндарнага цыклу – у храналагічным плане, і ў арэальным плане – паступова ахоплівалася ўся тэрыторыя Беларусі, пачыналі вылучацца яе мясцовыя своеасаблівасці (Паўлоўская Л.І. (1853), В. Сыракомля (1853), П. Шпілеўскі (1853–56), І. Юркевіч (1853), Е. Фялінская (1856), А. Кіркор (1858), В. Невяровіч (1859), В. Быкоўскі (1868), З. Глогер (1868), Е. Кучынскі (1868), В. Сакалоў (1869), П. Маркоўскі (1870), М. Дзмітрыеў (1869), г.д.), а таксама шматбаковыя этнаграфічныя апісанні губерній: Віцебскай (1854, 1865, 1867), Смаленскай (1859, 1862), Віленскай (1861, 1868), Гродненскай (1863, 1869), чаму дарэчы паспрыялі работы па выданню "Матэрыялаў для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраных афіцэрамі Генеральнага штаба").

У той жа час з'явіліся грунтоўныя працы па летазлічэнню і храналогіі краю Н.І. Гарбачэўскага (1867, 1869).

Завяршаючая фаза перыяду адзначана павышэннем значнасці аналітычных раздзелаў у каляндарных, як і наогул у фальклорна-этнаграфічных даследваннях тэрыторыі Беларусі. Галоўная іх мэта – засваенне сістэматызацыі і класіфікацыі назапашаных матэрыялаў.

Метадалагічным падмуркам тых часоў былі ідэі "міфалагічнай школы". Адпаведна ім, навукоўцы імкнуліся вылучыць не толькі арыгінальныя мясцовыя рысы (пераважна сакральнага зместу), але і агульнакаранёвыя, што ўвасабляюць этнічныя вытокі. Натуральна, выконваліся і этналагічныя абагульненні, і ўжо ў фундаментальным 3-х-томным выданні расійскага навукоўца А. Афанас'ева (1865–69) шэраг беларускіх каляндарных святаў быў уведзены ў катэгорыю "агульнаславянскіх". Таксама, побач са значным пашырэннем кола беларускіх даследчыкаў, у мясцовых фальклорна-

этнаграфічных працах пераважаў замежны метадалагічны ўплыў, і найболей – ад расійскай навуковай школы.

Дадзены перыяд, у цэлым, ацэньваецца як перыяд зараджэння беларускай *навуковай фалькларыстыкі і этнаграфіі*. Адметна, что А. Мейер, М. Чарноўская, І. Шыдлоўскі звярнуліся да вывучэння беларускай народнай творчасці з пэўных навуковых пазіцый. Да гэтага часу ў розных славянскіх краінах ствараліся навуковыя гурткі і таварыствы, мэтай якіх было паглыбленае вывучэнне гісторыі славян, іх мовы і паэзіі, выяўленне агульнасці і адметных рыс у розных праявах іх матэрыяльнай і духоўнай культуры, асабліва міфалогіі. Вывучэнне славянскай міфалогіі садзейнічала абгрунтаванню ідэі адзінства славянскага свету, адзінства паходжання славянскіх народаў, якая аказала моцны ўплыў на станаўленне і развіццё славянскай, у тым ліку і беларускай, фалькларыстыкі.

Уплыў гэтага напрамку адчуваецца ў публікацыі М. Чарноўскай «Рэшткі славянскай міфалогіі, захаваныя ў звычаях вясковага люду на Белай Русі» (1817), дзе прыведзены апісанні некаторых абрадаў (Купалля, Радаўніцы, «зялёных святак»), тэксты звязаных з імі песень. Артыкул мае ў асноўным апісальны характар, але і М. Чарноўская, і рэдакцыя спрабуюць даць тлумачэнне асобным прыведзеным тут фальклорна-этнаграфічным з'явам, якія трактуюцца ў святле распаўсюджанай у той час тэорыі міфалагічнай школы.

У першай палове 19 ст. у сувязі з пашырэннем ідэй рамантызму, агульным развіццём грамадскай і навуковай думкі адбыўся рост цікавасці да беларускага фальклору. Ужо ў асяроддзі студэнтаў і выкладчыкаў Віленскага ўніверсітэта (1820-я г.) запісы яго ўсё часцей трапляюць у друк, у тым ліку запісы абрадавых песень і саміх абрадаў. Асобныя звесткі аб каляндарных звычаях і абрадах беларусаў былі апублікаваны ў артыкулах К. Фалютынскага і А. Мухлінскага. Паўней прадстаўлены яны ў кнігах А. Рыпінскага, Л. Галамбёўскага, у зборніках Я. Чачота, у публікацыях Р. Зянькевіча, М. Анімеле, А. Кіркора і інш.

У сярэдзіне 19 ст. асобныя беларускія каляндарныя абрады і звычаі даволі грунтоўна апісаў П. Шпілеўскі. Яму належыць адно з самых поўных апісанняў валачобніцтва. Новыя звесткі аб беларускім земляробчым календары і звязанай з ім абраднасці можна знайсці ў кнізе М. Дзмітрыева «Збор песень, казак, абрадаў і звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю» (1869).

Этнаграфічнае вывучэнне народаў Расійскай імперыі, у тым ліку беларусаў, асабліва актывізавалася пасля заснавання ў 1845 г. Рускага геаграфічнага таварыства. У выніку актыўнай збіральніцкай дзейнасці членаў і карэспандэнтаў РГТ (асабліва яго Паўночна-Заходняга аддзела, які быў

створаны ў Вільні ў 1867 г.) былі назапашаны і надрукаваны багатыя этнаграфічныя звесткі пра беларусаў, што далі магчымасць вучоным перайсці ад агульнага апісання да навуковага аналізу асобных жанраў і відаў беларускага фальклору.

Спецыяльна календару, каляндарнай абраднасці былі прысвечаны публікацыі Ю. Крачкоўскага і І. Бермана. Пры гэтым калі ў Бермана скрупулёзна прасочаны каляндарны год аднаго рэгіёна, дакладней, адной мясцовасці (Валожыншчыны), то Крачкоўскі ахапіў яго ў маштабе цэнтральнай і заходняй Беларусі, даў навуковае асэнсаванне ў цэлым.

Шмат цікавых матэрыялаў па каляндарнай звычаёвасці і абраднасці Беларусі, асабліва ўзятых па асобных святах, было апублікавана ў другой палове 19 ст. у перыёдыцы, у губернскіх і часткова епархіяльных ведамасцях.

Агляд гадавых свят, звычаяў і абрадаў паўднёва-ўсходняй Беларусі маецца ва ўводзінах да кнігі З. Радчанкі «Гомельскія народныя песні» (1888). Даволі дэталёва, па месяцах, праца і звычаі земляроба разглядаюцца ў публікацыі М. Косіч «Літвіны-беларусы Чарнігаўскай губерні, іх побыт і песні» (1901).